*Сімптаматыка дысграфіі*

***© Н.В.Чамаданава***
***па кнігах Лалаевай Р.І.***

Асаблівасці дысграфічных памылак:

- устойлівыя і спецыфічныя, шматлікія, якія паўтараюцца і захоўваюцца доўгі час;
- звязаныя з несфарміраванасцю ВПФ, якія прымаюць удзел у працэсе пісьма;
- характарызуюцца парушэннем фанетычнага прынцыпа пісьма;
- назіраюцца ў дзяцей школьнага, а не дашкольнага узросту.

**Группы дысграфічных памылак:**

1. Памылкі на узроўне буквы і складу:

1. *Пропуск літар і складоў* (дзіця не вылучае ў складзе слова усіх яго кампанентаў; могуць правакаваць такія памылкі наступныя ўмовы: сустрэча двух аднолькавых літар на стыку слоў – НА МЫЦЬ – замест НАМ МЫЦЬ; суседства складоў, якія ўключаюць аднолькавыя літары – НАСТА – замест НАСТАЛА, КОНІ – вместо КОНІКІ)
2. *Замены літар*: калі дзіця яшчэ недакладна суадносіць фанэму з графемай; замены аптычна падобных літар (з аптычна падобнымі элементамі: в-д, л-м, ц-щ, па кінестэтычнаму падабенству: А-О, Б-Д, И-У, П-Т, Х-Ж)
3. *Змяшэнне літар*: па акустыка-артыкуляторнаму падабенству – З-С (КАСЛЯНЯ замест КАЗЛЯНЯ, КАЗАТКА замест КАСАТКА), В-Ф (ФАФЛЯ замест ВАФЛЯ), С-Ш (ШАША замест САША), Л-Р (ХАРОДНЫ замест ХАЛОДНЫ)
4. *Перастаноўкі* (не здольны зрабіць аналіз гукаў у слове – НЁ замест ЁН, ДА ШКОЛЫ замест АД ШКОЛЫ, ЗІАМ замест ЗІМА)
5. *Устаўкі* (назіраюцца пры сцёку зычных – ШЭКОЛА, ДЗЯЎЧЫНАКА).
6. *Персеверацыі* (адзначаецца слабасць дыферэнцыраванага тармажэння – НАСНАСТУПАЛІ замест НАСТУПАЛІ, НАСТАЎТАЎНІЦА замест НАСТАЎНІЦА)

2. Памылкі на узроўне слова:

1. *Паасобнае напісанне частак слова*: калі прыстаўка, пачатковая літара/склад нагадвае прыназоўнік, займеннік, злучнік: І ДУЦЬ замест ІДУЦЬ, Я СНЫ замест ЯСНЫ; пры стёку зычных: Б РАТ замест БРАТ, ПАП РАСІЦЬ замест ПАПРАСІЦЬ.
2. *Злітнае написанне* (слова с наступным / папярэднім: КАЛЯСАСНЫ замест КАЛЯ САСНЫ, ДАДОМУ замест ДА ДОМУ, БЫЛІЦУДОЎНЫЯДНІ замест БЫЛІ ЦУДОЎНЫЯ ДНІ)
3. *Кантамінацыі* (ЛЕПБАБУ замест ЛЕПЯЦЬ БАБУ, БЛЗМ замест БЫЛА ЗІМА)
4. *Скажэнне структуры сказа*: не адзначаюцца мяжы сказа, узгодненнасць членаў сказа ў родзе, ліку, склоне (аграмматызмы) – ШМАТ АЛОЎКІ замест ШМАТ АЛОЎКАЎ, НА ВЕТКАЎ замест НА ВЕТКАХ, цяжкасці ў выкарыстанні праназоўнікаў (ВЫЙСЦІ ДОШКІ замест ВЫЙСЦІ ДА ДОШКІ)